УДК 947.6

**С.У ГРЫБАВА**
Мінск, РІВШ

## ПРАДСТАЎНІКІ ІЎЕЎСКАЙ ТАТАРСКАЙ АБШЧЫНЫ НА ФРАНТАХ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Татарскае насельніцтва Беларусі, побач з іншымі народамі краіны, удзельнічала ў розных формах антыфашысцкага супраціўлення, як на тэрыторыі рэспублікі, так і за яе межамі. Унеслі свой уклад у агульную перамогу над ворагам падчас Другой сусветнай вайны і прадстаўнікі іўеўскай татарскай абшчыны.

Першапачаткова трэба звярнуць увагу на постаць іўеўскага татарына **Шабановіча Халіля Аляксандравіча**, які нарадзіўся 4 красавіка 1926 г. Пасля мабілізацыі ў Чырвоную Армію, ён разам з іншымі навабранцамі прайшоў курс маладога байца у г. Шуя (Іванаўская вобл., Расія), і адразу быў адпраўлены на фронт (Інфармацыя атрымана ў выніку размовы з братам Шабановіча Х.А. Шабановічам І.А. 25.12.2007 г.) З 16 снежня 1944 г. па 4 студзеня 1945 г. ён змагаўся на 2-м Украінскім фронце, у якасці радавога 767 стралковага палка 228 Вазнясенскай стралковай дывізіі [1, л. 111]. Удзельнічаў у баях за Венгрыю і Чэхаславакію. 12 студзеня 1945 г. Шабановіч Х.А. быў паранены ў левае бядро, у выніку чаго апынуўся ў шпіталі ў г. Брно [2]. Пасля ВАВ, паправіўшы здароўе, з 9 жніўня 1945 г. па 2 верасня 1945 г. ён удзельнічаў у вайне з Японіяй [1, л. 111]. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны быў накіраваны ў Порт-Артур, дзе праслужыў 5 гадоў. Улетку 1950 г. Шабановіч Халіль Аляксандравіч вярнуўся ў родныя мясціны з такімі ўзнагародамі, як медалі “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.”, “За перамогу над Японіяй”, “За баявыя заслугі”. (Інфармацыя з уліковай картачцы ўдзельніка вайны, архіў Іўеўскага РВК) Атрымаў таксама ліст з падзякай за асабістым подпісам І. В. Сталіна, юбілейныя ўзнагароды. У Іўі ён пражываў па вул. Савецкай, 72. Працаваў на аптовай базе кладаўшчыком.

Браты **Гамбер і Сулейман Рафаловічы** з Іўя таксама змагаліся ў радах Чырвонай Арміі. Сулейман быў прызваны ў 1940 г. на тэрміновую службу ў армію. Падчас ВАВ ён браў удзел у баях за вызваленне Ленінграда. У архіве Іўеўскага РВК захоўваецца Паведамленне 194-га асобнага сапёрнага батальёна ад 17.02. 1945 г. аб смерці Рафаловіча Сулеймана Іванавіча, які загінуў 28 студзеня 1945 г. і пахаваны ў Познаньскім ваяводстве. Паведамленне было ўручана яго бацьку Рафаловічу Івану Мустафавічу 10 сакавіка 1945 г. [3, л. 124]. Не вярнуўся з вайны і другі яго сын, Гамбер, які

быў мабілізаваны ў 1944 г. У пасведчанні аб смерці № 019 108 артылерыйскага палка згадваецца, што тэлефаніст, Рафаловіч Гамбер Іванавіч, прапаў без вестак 31 студзеня 1945 г. [3, л. 125].

На франтах вайны ў складзе 221 стралковага палка, 77 стралковай Чарнігаўскай дэвізіі змагаўся ўраджэнец Іўя **Радлінскі Якуб Мустафавіч** (1925 г.н.). Ён быў мабілізаваны на фронт Іўеўскім РВК у 1944 г. 18 красавіка 1945 г. загінуў у баі, верны воінскай прысязе. Радавы Рафаловіч Якуб Мустафавіч пахаваны ў Германіі, у г. Франкфурт-на-Одэры. Паведамленне аб яго смерці было ўручана бацьку, Радлінскаму Мустафе Якубавічу, 1 чэрвеня 1945 г. [3, л. 126]

Іўеўскі татарын **Шабановіч Мацвей Якаўлевіч**, знаходзячыся ў рэзерве, у 1941 г. быў забраны на 40-дзенныя ваенныя зборы, падчас якіх у выніку бамбардзіроўкі нямецкай авіяцыі прапаў без вестак. (Інфармацыя атрымана ў выніку размовы з іўеўскім мулой Шабановічам І.А. 25.12.2007 г.) Аднак па іншых дадзеных, якія змешчаны ў кнізе "Памяць" Іўеўскага раена, Шабановіч Мацвей Якаўлевіч прапаў без вестак у кастрычніку 1945 г. [4, с. 291].

**Радкевічу Мацвею Бякіравічу** (1910 г.н.) пашчасціла вярнуцца ў Іўе з вайны. Са студзеня 1945 г. па май 1945 г. ён ваяваў у якасці мінаметчыка 210 мінаметнага палка 1-га Беларускага фронту [1, л. 109]. Радкевіч М.Б. удзельнічаў у вызваленні Польшчы, у тым ліку Варшавы (інфармацыя з уліковай картачцы ўдзельніка вайны), а таксама браў удзел у Берлінскай аперацыі, у сустрэчы з войскамі саюзнікаў на р. Эльба. (Інфармацыя атрымана ў выніку размовы з іўеўскім мулой Шабановічам І.А. 25.12.2007 г.) За заслугі перад Радзімай ён быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, такімі медалямі, як "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.", "За ўзяцце Берліна", "Дваццаць гадоў перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг." [1, л. 109]

**Сафарэвіч Селім Сулейманавіч**, які нарадзіўся ў Іўі 23 верасня 1923 г. таксама змагаўся з ворагам у шэрагах Чырвонай Арміі. З 1 студзеня 1945 г. па 28 лютага 1945 г. ён быў куляметчыкам 202 запаснога стралковага палка на 2-м Беларускім фронце [1, л. 110]. Ён прымаў удзел у вызваленні Польшчы і Чэхаславакіі, у тым ліку Прагі. У лютым 1945 г. быў паранены ў правае перадплечча. За ўклад у перамогу над ворагам С.С. Сафарэвіч быў узнагароджаны медалямі: "За адвагу", "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.", "Дваццаць гадоў перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.", "50 гадоў Узброеных Сіл СССР". Пасля вайны пражываў у Іўі па вуліцы Савецкай, 22. (Інфармацыя з уліковай картачцы ўдзельніка вайны, архіў Іўеўскага РВК)

Іўеўскія татары, браты **Якубоўскія – Халіль і Якуб Амуратавічы** таксама вярнуліся да дому, аднак Халіль застаўся інвалідам без нагі.

Дарэчы, Якуб Амуратавіч (1905 г. н.) падчас мабілізацыі ў 1944 г. пажадаў ваяваць у складзе Польскай Арміі. Яшчэ адзін брат Якубоўскіх, **Ях'я Амуратавіч**, які на той момант жыў з сям'ей у г. Навагрудак, таксама быў мабілізаваны ў 1944 г., аднак ён у гэтым жа годзе загінуў у Познані.

У баях з нямецкімі захопнікамі ваявалі два сыны іўеўскага татарына Адама Хасіневіча Якаў і Аляксандр. Ім пашансіла вярнуцца да дому [5, с. 33]. Радавы стралковага палка **Якаў Адамавіч Хасіневіч** у 1944 г. быў цяжка паранены нямецкім снайперам. Пасля вайны ён атрымаў шэраг урадавых узнагарод. Удзельнік вызвалення Беларусі **Аляксандр Адамавіч Хасіневіч** прайшоў нялегкі баявы шлях да Берліна. Ён узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны і шэрагам медалёў [6, с. 136].

У брацкай магіле каля Іўя пахаваны радавы 168-га сп 24-й сд Якубоўскі, які загінуў 25 чэрвеня 1941 г. [4, с. 281]. У брацкай магіле каля в. Трабы Іўеўскага раёна пахаваны радавы гэтага ж вайсковага фарміравання Александровіч, загінуўшы 27 чэрвеня 1941 г. [4, с. 283].

Прадстаўнікі Іўеўскай татарскай абшчыны змагаліся супраць ворагу ў складзе розных ваенных фарміраванняў на франтах вайны. У сваей большасці яны былі мабілізаваны ў 1944 г. Некаторыя з іх загінулі, верныя воінскай прысяге, падчас ваенных дзеянняў, некаторых усе ж родныя дачакаліся да дому. Усе іўеўскія татары былі радавымі салдатамі, аднак не вярталіся без узнагарод. На вялікі жаль, на сучасны момант сярод прадстаўнікоў іўеўскай татарскай абшчыны не засталося ў жывых ніводнага ветэрана Вялікай Айчыннай вайны.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Архіў Іўеўскага РВК. Спр. 129. Список на выдачу удоставерений участникам войны.

2. Архіў Іўеўскага РВК. Спраўка аб раненні ЭГ № 233 ад 11.05. 1945.

3. Архіў Іўеўскага РВК. Спр. 109 ( том 2).

4. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Іўеўскага раена / рэдкал.: Г.К. Кісялеў [і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 510 с.

5. Лыч, Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX –пач. XXI ст.) / Л. Лыч. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 76 с.

6. Иоффе, Э. К вопросу об участии татар в Великой Отечественной войне на территории Беларуси / Э. Иоффе // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі: матэрыялы другой міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 19-20 траўня 1995 г. / Бел. дзярж. пед. ін-т імя М.Танка і інш.; рэдкал.: І. Канапацкі [і інш]. – Мінск, 1996. – Ч. 1. – С. 130–137.